Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16. | | | |
| **ЛОТ №1** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| Б 3/к Административно-бытовой корпус | Здание многофункциональное | 702,8 кв. м | 500/С-45993 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с учетом НДС 20%** | **1 242 686,40 бел.руб. Снижена на 20%** | | | |
| **ЛОТ №2** | | | | |
| Г 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 4157,2 кв. м | 500/С-45994 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **3 073 188,48 бел.руб. Снижена на 20%** | | | |
| **ЛОТ №3** | | | | |
| Д 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 1115 кв. м | 500/С-45995 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **1 228 488,00 бел.руб. Снижена на 20%** | | | |
| **ЛОТ №4** | | | | |
| Ж 1/к Производственный корпус | Здание многофункциональное | 886,1 кв. м | 500/С-45996 | г. Минск, ул. Октябрьская, 16 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **1 082 056,32 бел.руб. Снижена на 20%** | | | |

**Сведения о земельном участке**:

**Кадастровый номер:** 500000000003004776. Адрес: г. Минск, ул. Октябрьская, 16. **Площадь (га): 1,7466. Категория:** земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения. **Целевое назначение:** эксплуатация и обслуживание зданий многофункциональных по ул. Октябрьской, 16, зданий специализированных иного назначения по ул. Октябрьской, 16, 16/6, 16/7. **Вид права:** предоставлен продавцу на праве аренды по 31.03.2026. Земельный участок является неделимым и будет предоставлен покупателям в общую долевую аренду. **Обременения (ограничения):** водоохранная зона рек и водоемов, площадь 1,7466 га; охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0446 га; охранная зона электрических сетей, площадь 0,0065 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, площадь 0,0204 га; зона охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, площадь 0,8318 га

**Условие аукциона:** дальнейшее использование объектов недвижимости, являющихся предметом аукциона, новым собственником должно производиться в соответствии с утвержденным проектом детальной планировки, разработанным в соответствии с генеральным планом г. Минска. Предметы аукциона являются историко-культурной ценностью. При приобретении права собственности на материальную историко-культурную ценность новый собственник (владелец) этой историко-культурной ценности обязан в течение одного месяца подписать охранное обязательство по форме, установленной Министерством культуры Республики Беларусь. Невыполнение этого условия влечет за собой признание такой сделки недействительной

**Обременения:** объекты недвижимости обременены договорами залога (ипотека, правообладатель ОАО «БПС-Сбербанк») и договорами аренды. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона и Продавца

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № **3012343260010**; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – **3012743260072**; в евро (EUR) – **3012343265060**; в российских рублях (RUB) – **3012743260098**; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 07.02.2017

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **WWW.CPO.BY**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **15.03.2017** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **13.03.2017** до 17 ч.00 мин по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71; +375 29- 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |
| **Сайт организатора аукциона** | **WWW.CPO.BY** |



**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1 Автомобиль MERCEDES-BENZ ATEGO 1222L, год выпуска – 2012, цвет: черный, VIN №WDB9702551 L684077, стоимостью 95 855,00 рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | ЧТУП «ВитКаскадСтрой» (УНН 390497664) |
| Наличие обременений | Декрет Президента Республики Беларусь №6 от 07.05.2012 г. |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Витебск, ул. С. Панковой, 3 |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 09.03.2017 в 12.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by) Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 610421, (8033) 6879148. |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 07.03.2017 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |


■ Фэсты

# «БАЗАР» ЗДЗІВІЦЬ ІЗНОЎ

**XXVI Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» будзе не меней разнастайны і насычаны падзеямі, чым мінулы. Афіцыйна ён пройдзе з 13 па 17 ліпеня. Сёлета юбілей у дзіцячага конкурсу «базару»: адбудзецца 15-ты раз!**

Улічваючы, што фэст №1 на прасторах былога СССР даўно стаў заслужана «народным», арганізатары стараюцца, каб «дэмакратычным» быў кошт білетаў. У прыватнасці, плата за задавальненне ўбачыць некаторыя праекты на ўзроўні пазамінулага года. Што цікава, па традыцыі самыя дарагія білеты купляюць у першую чаргу.

— Як заўсёды, да пачатку фестывалю і пасля сканчэння адбудуцца канцэрты. Сёлета: 11—12 і 18—19 ліпеня, — расказвае **кіраўнік дырэкцыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі фестываляў Аляксандр СІДАРЭНКА.**

Пачаўся першы этап продажу білетаў на канцэрты: урачыстага адкрыцця і закрыцця, другога дня фіналу XXVI Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск». Як і на сольныя канцэрты: Рыгора Лепса, Стаса Міхайлава, Валерыя Меладзэ, Рыгора Крыда, гурта «Руки вверх», сатырычнага шоу «Аднойчы ў Расіі», гурта «Сплин».

З 20 лютага білеты можна набыць не толькі ў Віцебску, але і на www.ticketpro.by і www.kvitki.by.

Адрозненне чарговага фестывалю ў тым, што пераможцаў XV Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск» вызначаць да цырымоніі афіцыйнага адкрыцця «базару». І віншаванне запланавана арганізаваць на сцэне Летняга амфітэатра. Ужо другі год запар у конкурсе прымуць удзел па адным прадстаўніку ад краін-заснавальніц фэсту: Беларусі, Украіны і Расіі.

Па-ранейшаму ў цэнтры ўвагі конкурс маладых спевакоў. У паўфінале яны выканаюць «нацыянальны хіт» (папулярныя песні краін-удзельніц конкурсу на мовах гэтых краін). У першы дзень фіналу — «славянскі хіт» (песні славянскіх аўтараў на славянскіх мовах у суправаджэнні аркестра). А ў другі дзень фіналу — песні на свой выбар з ліку вядомых усім хітоў. Узнагароджанне пераможцаў можна будзе ўбачыць на цырымоніі закрыцця фестывалю.

Сёлета дырэкцыя ўводзіць новую паслугу для прыхільнікаў згаданага вышэй конкурсу — абанемент на ўсе падзеі. Ён дае права наведвання трох мерапрыемстваў.

А на ўсе праекты фестывалю можна набыць падарункавыя сертыфікаты наміналам 10, 20, 30, 50 і 100 рублёў. Гэта можна зрабіць і праз інтэрнэт. Абмяняць іх на білеты можна ў касах Віцебска, Гомеля і Мінска па 19 ліпеня (уключна).

Па добрай традыцыі падчас «базару» адбудуцца Дзень моладзі, канцэрт у рамках Дня Саюзнай дзяржавы, праекты: «Лялечны квартал», «Тэатральныя сустрэчы»...

У гэтым годзе трэці раз арганізуюць фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах», дзе можна будзе ўбачыць інтэрактыўныя выступленні вулічных тэатраў, музыкантаў, перформераў, лялечных тэатраў і артыстаў.

Працягваючы традыцыю супрацоўніцтва з фестывалямі розных краін, плануецца правесці III Міжнародную канферэнцыю «Фестывальны рух. Традыцыі і інавацыі». На яе запросяць арганізатараў фестываляў. Арганізуюць і пасяджэнне савета Сусветнай асацыяцыі фестываляў (САФ).

«Базар» — гэта месца, куды хочацца вяртацца зноў. На думку кіраўніка дырэкцыі, адмена віз для замежнікаў паспрыяе павелічэнню колькасці турыстаў з іншых краін. Фестываль можа стаць такім жа брэндам, як славуты бразільскі карнавал. Уявіце сабе: толькі на галоўнай фестывальнай пляцоўцы — у Летнім амфітэатры — плануецца правесці 17 канцэртных праграм. У тым ліку дзве начныя. Агульную колькасць мерапрыемстваў складана падлічыць.

Віцебск падчас насычанага фестывальнага марафону толькі некалькі часоў адпачывае ад падзей. Амаль што круглыя суткі тут працуюць кірмашы, спяваюць, танцуюць...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*

■ Гучная справа

# «ЯГО ЗАМКНЁНАСЦЬ МЯНЕ ПУЖАЛА»

**Мінскі гарадскі суд працягвае разглядаць гучную справу па забойстве бензапілой у гандлёвым цэнтры «Еўропа». Учора пасля абеду на допыт былі выкліканы бацькі Казакевіча. Маці Улада, Вольга, зграбная бландынка з ціхім голасам, запэўнівала, што ў яе з сынам заўсёды былі добрыя адносіны.**

— Ён быў паслухмяным з дзяцінства, займаўся спортам, добра вучыўся. Падстаў да канфліктаў не даваў, — расказала яна. Па словах Вольгі, Уладзіслаў ніколі не жыў адзін.

— 7 сакавіка 2014 года я выйшла замуж *(за грамадзяніна Германіі, з бацькам Казакевіча яна даўно ў разводзе. —* **Аўт.**). Калі і з'язджала, магла толькі на тыдзень яго пакінуць. Ён заўсёды мог пра сябе паклапаціцца. Умеў прыгатаваць усё, што любіць з ежы.

Вольга ўспамінае, што самы цяжкі перыяд для яе быў — пасля шпіталізацыі Улада ў Навінкі: «Для мяне было шокам, калі я даведалася, што гэта была чацвёртая спроба самагубства... Пасля гэтага сын стаў замкнёным. Замкнёнасць мяне вельмі пужала. Але я заўсёды лічыла гэта асаблівасцю яго характару».

— Ці высветлілі вы прычыны спроб суіцыду сына? — спытаў дзяржаўны абвінаваўца ў маці Казакевіча.

— Не высветліла. Я як ні пыталася, Улад казаў: «Усё добра. Было і прайшло. Не хвалюйся». Я хадзіла кожны дзень да сына ў бальніцу, але гэта яго раздражняла. Я старалася мякка з ім размаўляць. Ніколі нічога ад яго не патрабавала.

Пасля лячэння ў Навінках Казакевіч перайшоў у іншую школу. Так зрабіць яго маці раілі псіхолагі, святар. «У гімназіі думалі, што мы хацелі на больш лёгкую праграму перавесціся. Але мы толькі хацелі, каб Уладу было лепш», — успамінае Вольга. Калі на пачатку мінулага года жанчына даведалася, што сын можа зняцца з уліку ў псіхіятрычным дыспансеры, яна была рада. «Усе шарахаліся ад мяне: як гэта ў цябе сын стаіць на ўліку? Я ж не ведала, што маё дзіця хворае!» Застацца ў судзе і паслухаць працэс маці не захацела. Бацька Казакевіча Валянцін успамінае: пра тое, што сын хоча скончыць жыццё самагубствам, даведаўся ад класнага кіраўніка. «Яна патэлефанавала 9 кастрычніка (2014-га. — **Аўт.**) і сказала, што атрымала ад Улада вельмі дзіўную эсэмэску. Я адразу пазваніў у міліцыю ці МНС, не памятаю, паведаміў гэту інфармацыю. Назваў нумар сына і папрасіў устанавіць яго месцазнаходжанне», — расказаў Валянцін. Бацька падлетка вырашыў для сябе, што прычына суіцыду была ў канфлікце з класным кіраўніком.

— У іх былі няпростыя адносіны. Псіхалагічная несумяшчальнасць, — растлумачыў ён.

— Вы ведаеце, чаму ваш сын зняўся з уліку? — пацікавіўся дзяржаўны абвінаваўца.

— У дыспансер мы ездзілі «для галачкі». Зайшлі на 10 хвілін, адзначыліся, выйшлі. Нічога не адбывалася. Навошта тады стаяць на ўліку? — адказаў Валянцін. Незадоўга да трагедыі ў ГЦ «Еўропа» Улад патэлефанаваў бацьку. Падлетак быў у добрым настроі.

— «А як тая шведская марка тваёй пілы называецца?» — спытаў ён. Я назваў. «А што?» — пацікавіўся я. Ён: «Нічога. У мяне ёсць адна ідэя». Кажу сыну: «Прыходзь да мяне ў гараж, патрэніруешся пілой карыстацца, у мяне пні ёсць. Я падумаў, у яго з'явілася цяга да ручной працы...»

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Можа, гэта вясна?

## Сіноптыкі абяцаюць, што на наступным тыдні да нас зноў вернецца цяпло



**А ў гэтыя выхадныя ў Беларусі чакаюцца кароткачасовыя ападкі, а ўначы невялікія замаразкі, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Сёння ў краіне будзе ісці мокры снег і дождж, а на асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 1—7 цяпла, а па поўдні — да плюс 10 градусаў. Ужо ў суботу чакаецца пахаладанне, бо ўслед за атмасферным фронтам на тэрыторыю краіны распаўсюдзяцца больш халодныя і няўстойлівыя паветраныя масы з боку поўначы Еўропы. Тэмпературны фон панізіцца, але ўсё роўна застанецца вышэйшым за кліматычную норму другой паловы лютага. Пройдзе кароткачасовы снег і падмарозіць, уначы тэмпература паветра панізіцца да мінус 1—7 градусаў, а ўдзень будзе ад 3 марозу да 3 цяпла. Па паўночнай частцы краіны захаваецца моцны парывісты вецер. У нядзелю ўначы ў паўночна-ўсходніх і заходніх раёнах пройдзе кароткачасовы снег, тэмпература панізіцца да 1—8 марозу. Раніцай і ўдзень пад уплывам чарговай сістэмы атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы, на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца кароткачасовыя ападкі (мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж), слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак надвор'ем пачнуць кіраваць вільготныя і больш цёплыя паветраныя масы. Уначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень — у паўночна-ўсходніх і паўднёва-заходніх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж). Месцамі чакаецца слабы туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла, удзень — плюс 1—6 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 8 цяпла. Сіноптыкі прагназуюць, што ў аўторак і сераду ў Беларусі будуць гаспадарыць вельмі цёплыя паветраныя масы, якія рухаюцца з боку паўднёвага захаду Еўропы. Чакаецца, што ў аўторак будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўночна-заходніх раёнах краіны пройдуць невялікія дажджы. Чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — 2—8 цяпла, а па поўдні — да плюс 10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*kurkach@zviazda.by*